**ВОДЗЫЎ**
**на аўтарэферат дысертацыі Сямашка Надзеі Канстанцінаўны**
**"Беларускія і расійскія даследаванні аграрнай гісторыі Беларусі (канец XVIII ст. – 1850-я гг.)"**, прадстаўленай на саісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.09 – гістарыяграфія, крыніцазнаўства і метады гістарычнага даследавання

Актуальнасць вывучэння аграрнай гісторыі абумоўлена тым фактам, што эканамічнае, сацыяльнае і культурнае адраджэнне рэгіёнаў і беларускай вёскі выступае на сучасным этапе адным з прыярытэтных кірункаў унутранай палітыкі Рэспублікі Беларусь. Грунтоўны аналіз гістарычнага вопыту папярэдніх пераўтварэнняў у аграрным сектары дзяржавы дапаможа садзейнічаць паспяховай рэалізацыі гэтай палітыкі на сучасным этапе.

Дысертацыя складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі работы, чатырох глаў, заключэння, спіса выкарастанных крыніц і дадаткаў. Змест дысертацыі "Беларускія і расійскія даследаванні аграрнай гісторыі Беларусі (канец XVIII ст. – 1850-я гг.)", прадстаўленай на саісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.09 – гістарыяграфія, крыніцазнаўства і метады гістарычнага даследавання, адпавядае заяўленай спецыяльнасці і галіне навукі.

Саіскальнікам выкарыстаны шырокі набор метадаў для вывучэння праблемы, пераканаўча паказана канцэптуальная ідэя дысертацыі. Дысертантам устаноўлена, што першыя даследаванні па аграрнай гісторыі Беларусі з'явіліся ў XIX ст., на стыку эканамічных і гістарычных навук. Вывучэнне аграрнай гісторыі Беларусі ў савецкі перыяд ішло ў рамках адзінай на той час марксіцка-ленінскай метадалогіі, што суправаджалася суб'ектывізмам і звужанасцю тэматыкі, адаптацыяй беларускай гісторыі да афіцыйнага курса гісторыі СССР. Агульным у беларускай гістарыяграфіі з'яўлялася сцвярджэнне аб тым, што становішча ў аграрным сектары эканомікі Беларусі XIX ст. не адрознівалася ад вялікарускіх губерняў. З пачатку 90-х гг. XX ст. пашыраецца тэматыка даследаванняў гісторыі Беларусі канца XVIII ст. – 1850-х гг. Больш інтэнсіўна даследуецца сацыяльная гісторыя, гісторыя паўсядзённага жыцця, пачынаецца працэс кансалідацыі айчыннай гістарыяграфіі на аснове нацыянальна-дзяржаўнай канцэпцыі. Звяртаецца ўвага на ўрбанізацыйныя і дэмаграфічныя працэсы на беларускіх землях. Канец 90-х – пачатак 2000-х гг. характарызуецца адначасовым выхадам прац, якія яшчэ па-ранейшаму былі напісаны на аснове марксіцка-ленінскай метадалогіі, так і выданнямі на падставе новых падыходаў.

Вынікі навуковага даследавання адлюстраваны ў 16-ці публікацыях агульным аб'ёмам 4,4 (аўт. л.), з якіх 6 у часопісах, якія ўключаны ВАК Рэспублікі Беларусь у пералік навуковых выданняў для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў (2,3 аўт. л.) а таксама прайшлі апрабацыю на навуковых канферэнцыях.

Вывады і палажэнні дысертацыі, вынесеныя на абарону, маюць практычную значнасць і з'яўляюцца ўкладам у распрацоўку праблематыкі аграрнай гісторыі Беларусі канца XVIII ст. – 1850-х гг. Яны могуць быць

выкарыстаны пры напісанні абагульняючых прац і падручнікаў, пры распрацоўцы агульных і спецыяльных курсаў па гістарыяграфіі, гісторыі Беларусі, а таксама эканамічнай гісторыі Беларусі.

Аўтарэферат не ўтрымлівае прынцыповых недахопаў і адпавядае патрабаванням ВАК Рэспублікі Беларусь. Змест аўтарэферата сведчыць аб завершанасці навуковага даследавання, яго аўтару Сямашка Надзеі Канстанцінаўне можа быць прысуджана вучоная ступень кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.09 – гістарыяграфія, крыніцазнаўства і метады гістарычнага даследавання.

Рэктар установы адукацыі
«Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт»
кандыдат сельскагаспадарчых навук, дацэнт — Пяшко В.В.

Подпіс Пяшко В.В. сведчу:
Начальнік аддзела кадраў УА «ГДАУ» — Мельнік Л.М.

Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Рэспублікі Беларусь
Установа адукацыі «Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт»
РЭСПУБЛІКА БЕЛАРУСЬ